# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА
# В. І. КІРЫЛЕНКІ

**Перыяд дзеяння:**

з ліпеня 1941 г.

**Месца дзеяння:**

паселак Стадыённы, г. Віцебск

**Колькасць:**

невядома

**Кіраўнікі:**

Кірыленка Васіль Іванавіч

Кірыленка Васіль Іванавіч нарадзіўся ў 1904 г., да вайны быў участковым упаўнаважаным 3-га аддзялення міліцыі г. Віцебска. 10 ліпеня 1941 г. разам з многімі работнікамі міліцыі выехаў у бок Суража. Недалёка ад горада іх машыны былі затрыманы вышэйшым кіраўніцтвам вобласці. Тут жа, з ходу, адабралі 12 чалавек на чале з Е. Р. Навасельцавым для падпольнай работы ў Віцебску. У в. Скулавічы яны пераапрануліся ў цывільнае адзенне і паступова перабраліся ў горад, дзе ў многіх жылі сем'і або родзічы.

У групу Кірыленкі ўвайшлі жонка Лідзія Васілеўна, сын Уладзімір (нар. у 1929), сёстры Дар'я і Вера, браты Мікалай і падлетак Косця, а таксама іх сваяк М. Т. Харытонаў. У горадзе адразу ўзяліся за справу: збіралі зброю і пераносілі ў лес, вывучалі ворага і яго звычкі, прыглядаліся да людзей, на якіх маглі разлічваць у сваёй падпольнай дзейнасці. Нечакана былі арыштаваны іх кіраўнік Е. Р. Навасельцаў, а затым і сваяк Міхаіл Харытонаў. Навасельцава расстралялі, а Харытонаў быў выратаваны.

Паказальна, што ў вызваленні Харытонава дапамог Кірыленку намеснік начальніка гарпаліцыі Ф. Н. Калеснікаў. Ён жа паспрыяў, каб усе, за каго прасіў кіраўнік групы, атрымалі нямецкія дакументы і пропускі. Такім чынам, становішча падпольнай групы стала больш надзейным, і ад разведкі яны сталі пераходзіць да дыверсій. Асабліва гэта

дзейнасць актывізавалася, калі Кірыленка і Харытонаў у маі 1942 г. увайшлі ў партызанскую брыгаду «Аляксея»; Васіль Іванавіч узначаліў узвод брыгаднай разведкі.

**Факты з баявой хронікі групы.** Гэта было ў пачатку 1942 г. Вера Іванаўна, падлеткі Косця і Валодзя паклалі міну ў печ дома па вул. Фрунзэ, у якім жылі нямецкія афіцэры. Загінулі 12 фашыстаў. У тым жа годзе Вера, Косця і Валодзя паклалі міну пад Чэпінскі мост. Асаблівых пашкоджанняў узрыў не выклікаў, але сам факт дыверсіі меў пэўны эфект.

У сакавіку 1942 г. яны ж знішчылі машыну з боепрыпасамі на тэрыторыі трамвайнага парка. 28 красавіка 1942 г. на падкладзенай імі міне ўзарвалася легкавая аўтамашына камандзіра зенітчыкаў у Стадыённым пасёлку. Загінулі шафёр і яго пасажыр.

У жніўні 1942 г. сям'я Кірыленкі панесла цяжкія страты. Ахвярамі няшчаснага выпадку сталі юныя патрыёты Косця і Валодзя (насілі прозвішча Тарасаў). Яны накіроўваліся мініраваць аўтакалону каля Смаленскага рынку. На некаторай адлегласці за імі ішлі Вера і Лідзія Васілеўна. Каля моста цераз Віцьбу, на вул. Баўмана, у кішэні Валодзі ўзарвалася міна. Ён загінуў адразу, Косцю ж адарвала руку і нагу. У бальніцы ён памёр. Гітлераўцы спрабавалі што-небудзь даведацца ад хлопца, але ён нічога не сказаў.

Астатнія члены групы пакінулі горад і сталі партызанскімі разведчыкамі. Усе яны прынялі трагічную смерць, апрача Васіля Іванавіча і сястры Дар'і Іванаўны. Лідзія Васілеўна пры пераходзе шашы Віцебск – Сураж трапіла на засаду і была схоплена каля в. Краўцова. 33 дні пабояў і катаванняў перацярпела Вера Іванаўна ў ГФП-717 (інтэрнат ветінстытута). Яе расстралялі ў пойме р. Віцьба восенню 1942 г.

Загінуў і Мікалай Кірыленка, калі ўжо знаходзіўся ў партызанскім атрадзе і хацеў перавесці да партызан групу паліцэйскіх. Але на хутары Янукоўшчына паліцаі схапілі яго і перадалі ў СД. Больш ніхто яго не бачыў. Так вось склаўся лёс патрыётаў. З верай у перамогу яны ішлі на смерць і дзяцей вялі тым жа шляхам. Толькі за 1942 г. падпольшчыкамі Віцебска ажыццёўлены 102 дыверсіі. На працягу верасня 1943 г. яны здзейснілі 15, а ў кастрычніку – 32 дыверсій, у тым ліку і ў рэдакцыі газеты «Новый путь», і на складзе вайсковай часці № 607.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група В. І. Кірыленкі / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 486–487.